**Халецкі, А.** Крылы для  ўзлёту / А.  Халецкі // Ленінская праўда (Віцебск). — 1989. — 1 студз. — С. 2.

# КРЫЛЫ ДЛЯ ЎЗЛЁТУ

У апошні час там-сям на нашай зямлі беларускай з'явіліся магілы з надпісамі на абелісках: «Загінуў пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку». Адна з іх знаходзіцца і на ўскрайку пушчанскіх могіпак, дзе пахаваны астанкі першага ў раёне патрыёта-інтэрнацыяналіста Сяргея Ягоравіча Ярохі, загінуўшага на афганскай зямлі. Гэты шэраватага колеру заснежаны абеліск бачны здалёк...

...Заданне было дакладным і крайне сціслым: знішчыць групу душманаў, засеўшых у адным з  горных раёнаў. Тры баявыя верталёты ўзняліся ў паветра. Вызначаны раён сустрэў іх моцным  аўтаматным і кулямётным заградзіцельным агнём праціўніка. Першыя дзве машыны прайшлі на брыючым палёце і пачалі рабіць новы заход, а экіпаж, у якім змагаўся і лётчык - аператар лейтэнант С. Я. Яроха, не  паспеў. Варожыя кулі прашылі  верталёт, гарачым  свінцом апякло ногі і руку  Сяргея, але ён  заставаўся баяздольным.

Камандзір  зноў павёў машыну на душманскі «ланцуг». Заход. Наступны заход. 3  зямлі ўжо «агрызаліся» проціпаветранай зброяй...

Гэты вылет  быў не першым у баявой біяграфіі С.  Ярохі. Ён ужо меў адно раненне. Доўгі час адляжаў у ваенным шпіталі  ў  Кабуле. Пасля  прыязджаў у  водпуск. У размовах з  бацькам і маці  стараўся змякчыць сітуацыю. Маўляў, нічым не рызыкую... Таццяна Захараўна і Ягор Савельевіч не давяралі і з  трывогай працягвалі распытваць сына: «Як там?» Асабліва непакоілася маці. Толькі пасля пахавання яна даведалася  ад суседа, былога  франтавіка, што яе Сярожа прыязджаў на пабыўку пасля  ранення. Цяпер ужо  было ўсё роўна. Гора да маці прыйшло настолькі вялікае, што яна не магла паверыць, зразумець, навошта ў яе кватэры ганаровая варта ўзброеных салдат і чырвона-гальштучных  піянераў. Ёй хацелася паламаць цынкавую «турму», вызваліць сына, ажывіць сваёй ласкай і абняць.

Кватэра Ярохаў у той дзень стала месцам усеагульнай бяды. 3 усяго Бабініцкага сельсавета сюды сцякалася грамадскасць, ішлі  суседзі з Віцьбы. Да канца службы ў Афганістане С. Я. Яроху заставалася 2 месяцы. Ён марыў вярнуцца, згуляць вяселле ў бацькоўскай кватэры, а імя  сваёй нявесты трымаў у сакрэце да пары, да часу. Хто яна? Так і не даведаліся бацькі.

Сярожа нарадзіўся 7 лютага 1960 года, а 27 мая 1982 года яго не стала. Прагрымела рэха салюту, змоўкла мелодыя аркестра.

У Бабініцкай сярэдняй школе, якую ў свой час заканчваў С. Яроха, многае зроблена яго дзіцячымі  рукамі. Кожная прыступка, кожчы  камень тут памятаюць яго дзіцячы смех, кожны вучань тут з гонарам называе  яго прозвішча. У школьным краязнаўчым музеі –  яго асабістыя рэчы –  фуражка і лейтэнанцкія пагоны, некалькі фотаздымкаў, якія сабраны ў спецыяльны альбом. Туг жа – яго  пасмяротная ўзнагарода – ордэн Чырвонай Зоркі. Па просьбе педкалектыву і вучняў маці перадала ўсё гэта на вечнае захоўванне. У размове з Таццянай Захараўнай я даведаўся, што яна гатова была б аддаць у школу і мундзір  сына, але яго яшчэ раней давялося перадаць у музей камсамольскай  арганізацыі раёна. Сяргей быў камсамольцам, такім ён застаўся назаўсёды. Маладым, энергічным, прыгожым, невысокага росту, вясёлым, добрым і жыццярадасным.

Юныя ленінцы і камсамольцы клапоцяцца аб маці воіна, даглядаюць яго  магілу.

Класным кіраўніком у Сяргея быў дырэктар школы А. М. Гарчонак. Аляксандр Міхайлавіч

успамінае свайго выхаванца з вялікай гордасцю і павагай.

Адзін са старэйшых педагогаў, выкладчыца матэматыкі А. М. Мінц расказвала:

– Сярожа быў самым добрым і спагадлівым хлопчыкам у класе. З вучобай у яго не ўсё ладзілася. У асноўным атрымліваў здавальняючыя і добрыя адзнакі. Наогул, дзеці яго характару і тэмпераменту ў будучым становяцца людзьмі працы і таварыскасці. З дзяцінства ён марыў стаць лётчыкам і разам з тым ён любіў зямлю, працаваў на ёй і паступова, крок за крокам, ішоў да мэты.

Успамінае маці:

– Яшчэ калі ў школу хадзіў, Сярожа клапаціўся аб сям'і, аб сабе. Стараўся зарабіць сваімі рукамі на неабходнае. У час канікулаў працаваў на трактары, на балоце, дзе здабываў торф для абпалу цэглы, дапамагаў мне.

Быў паслухмяным хлопчыкам. Дроў разам з бацькам назапасіць у ярах і сена касілі, зграбалі, як карову трымалі. Прыбяжыць( бывала, да мяне на работу і кажа: «Дай, мама, я за цябе пагамую цэглу». А работа гэта цяжкая. Абедзве рукі з цаглінамі трэба раз-пораз, над галавой паднімаць ля гарачай печы для ўкладкі. Ягады любіў збіраць, грыбы. Рыбы бывала налавіць і нас з бацькам частуе. А зімой на лыжах хадзіў, або ў хакей гуляў. І цяпер яго клюшка з шайбай у кутку ляжаць. Таварышы любілі яго.

Вельмі любіў музыку. Добра іграў на гітары, якая засталася ў часці, як памяць. Папросіць хто-небудзь, заўсёды дапамагаў, не адмаўляў. Яго звалі хлопцы Сярога, а часам яшчэ дадавалі да імя мянушку, а то і звалі проста Кроха. Магчыма, з-за таго, што сын быў невысокага росту. «Кроха, зрабі электрычнасць у клубе» – прасілі ў Бялынавічах, куды ён часцей за ўсё наведваўся.

У дзяцінстве Сяргей выпаліў на фанернай дашчэчцы зайчыка, размаляваў яго і падарыў маці. Гэту рэч і ўсе аматарскія здымкі, на якіх ён у асноўным сфатаграфаваны разам з баявымі таварышамі і каля тэхнікі, на вуліцы, або ў цесным інтэрнаце ў мінуты адпачынку і вельмі рэдка – адзін, маці таксама беражэ.

Сваю мару стаць ваенным лётчыкам Сяргей ажыццявіў не адразу. У ДТСААФ атрымаў правы шафёра, пасля чаго ў ГПТВ-37 металістаў – пасведчанне слесара-аўтарамонтніка. Паспрабаваў папрацаваць на аутарамонтным заводзе, але там яму было не па душы. Перайшоў у тубдыспансер шафѐрам. Потым – вучоба на верталѐтчыка. І, нарэшце, закончыў Саратаўскае ваенна-авіяцыйнае вучылішча.

Рэдка прасыхаюць вочы Таццяны Захараўны. У яе доме вялікае гора, кожны дзень і кожны год. Спачатку ў дзевяцігадовым узросце трагічна загінуў Алёша. А потым і першынец – у 22! Не вытрымаўшы такога няшчасця, памёр Ягор Савельевіч. У новай кватэры, якую ім выдзелілі ў Доўжы, на яго крык аб дапамозе ніхто не адазваўся. Толькі адзін знаёмы сябар зайшоў, каб убачыць у апошні раз. Адзінокая, асірацелая жанчына не жадае пакідаць работу да пенсіі і не хоча ехаць туды, дзе абышліся абыякава і бяздушна з яе раптоўна паралізаваным мужам, якога ўжо нельга было вярнуць жывым у старую кватэру. Іх мэбля стаіць у пустых, нікім не занятых сценах у Доўжы. Жанчына хацела б жыць тут, у Бабінічах.

Пабыць з простай рабочай цагельнага завода, у яе старой паўпустой кватэры – ганарова. Нізка кланяюся перад подзвігамі С. Я. Ярохі, перад усімі, хто аддаў свае жыцці на далёкай зямлі Афганістана.

**А. Халецкі**